Голас Радзімы

№ 28 (1650)
17 ліпеня 1980 г.

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ТАВАРЫСТВА ПА КУЛЬТУРНЫХ СУВЯЗЯХ З СУАЙЧЫННІКАМІ ЗА РУБЯЖОМ
(БЕЛАРУСКАЕ ТАВАРЫСТВА «РАДЗІМА»)

Выдаецца з 1955 г.
Цана 4 кап.

Бадай, самая мірная на зямлі прафесія — прафесія будаўніка. Яшчэ ў школе марыла Галіна РАМЕЙКА аб ёй. Дзяўчына закончыла прафесійна-тэхнічнае вучылішча і атрымала спецыяльнасць тынкоўшчыцы. Зараз Рамейка працуе на камбінаце «Мінскбуд».
Фота Ю. ЗАХАРАВА.

100 МІЛЬЁНАЎ НА РЭКАНСТРУКЦЫЮ І ДОБРЫ НАСТРОЙ
[«Хада насустрач»]
стар. 2—3

Н. І Р. МАРТЫНЮКІ (Канада): «МЫ ЎБАЧЫЛІ БАГАТЫ І ШЧАСЛІВЫ КРАЙ...»
[«Наша благодарность беспредельна»]
стар. 5

ХТО СПРЫЯЕ СЛАВЕ МАЛАДЗЕЧНА!
[«Энтузіясты»]
стар. 7

На крутым беразе Дняпра, непадалёку ад Рагачова, размясцілася самая маладая ў Беларусі здраўніца — санаторый «Прыдняпроўскі». За кожную змену тут адпачнуць і паправіць здароўе больш за 500 чалавек. У санаторыі працуе высокакваліфікаваны медыцынскі персанал, кабінеты аснашчаны дасканалым сучасным абсталяваннем, адкрыты крыніцы мясцовай мінеральнай вады.
НА ЗДЫМКУ: так выглядае санаторый «Прыдняпроўскі».

Фота І. ЗМІТРОВІЧА.

● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ●

СТАРЭЙШАЯ БІБЛІЯТЭКА

Гродзенскай абласной бібліятэцы імя Я. Карскага — першай публічнай бібліятэцы ў Беларусі — сёлета спаўняецца 150 гадоў. Цяпер яна з'яўляецца буйным культурным цэнтрам вобласці. Кніжным фондам бібліятэкі, які налічвае чатырыста тысяч тамоў, карыстаецца больш за 20 тысяч жыхароў горада.

ПАЭТУ-ГРАМАДЗЯНІНУ

Здымачная група кінастудыі «Беларусьфільм» завяршае работу над дакументальнай стужкай, прысвечанай народнаму паэту БССР, вядомаму грамадскаму дзеячу, Герою Сацыялістычнай Працы, лаўрэату Ленінскай і Дзяржаўнай прэмій СССР і БССР Петрусю Броўку. Здымкі вяліся на радзіме паэта ва Ушацкім раёне, у Полацку, Мінску і іншых месцах, дзе жыў і працаваў П. Броўка.

АБЛЕГЧЫЦЬ І ПАВЯЛІЧЫЦЬ

Задаволіць патрэбнасці ў сыравіне абутковым і скургалантарэйным фабрыкам рэспублікі дапамог калектыў старэйшага ў беларускай сталіцы завода «Бальшавік». Тут завершана тэхнічнае пераазнашчэнне вытворчасці. Гэта дазволіла не толькі аблегчыць працу соцень людзей, але і больш чым у сорак разоў павялічыць выпуск эластычных матэрыялаў, якія карыстаюцца попытам. Па просьбе спажыўцоў асвоена вытворчасць вырабаў для лёгкага беспадкладачнага абутку.

ЖЫХАРАМ КРАЙНЯЙ ПОЎНАЧЫ

Нядаўна ў Ленінградскі марскі гандлёвы порт паступіла буйная партыя аўтатэхнікі, у тым ліку трактары, бульдозеры, грузавыя аўтамабілі БелАЗ з Беларусі. Усё гэта разам з прамысловымі і прадуктовымі таварамі, будаўнічымі матэрыяламі, бытавой тэхнікай прызначана жыхарам Крайняй Поўначы — геолагам, гарнякам, будаўнікам, паляўнічым. А даставяць іх у Певек, Ціксі, на Зялёны Мыс балтыйскія гандлёвыя судны. У іх ліку старэйшы з цеплаходаў-«беларусаў» — ветэран мора «Бабруйсклес», які мае лядовы клас і вялікі вопыт плавання ў высокіх шыротах.

«БЕЛАРУСЬ» ЕДЗЕ Ў КАНАДУ

Усесаюзнае аб'яднанне «Трактараэкспарт» працягвае супрацоўніцтва з фірмай «Беларусь эквіпмент оф Канада ЛТД». У Канаду адпраўлена першая партыя трактароў МТЗ-80 з новай уніфікаванай кабінай, якая поўнасцю герметызавана — у яе не пранікае пыл. Зроблена ўсё, каб механізатар у гарачыню і ў холад адчуваў сябе аднолькава добра. Вадзіцель сам можа рэгуляваць тэмпературу паветра. Плошча агляду павялічана больш чым у два разы, што дазваляе без цяжкасці назіраць за работай усіх прычапных і навясных прылад. Павышаны камфорт ствараюць абшыўка са штучнай скуры і зручнае крэсла.



У калгасе «Прагрэс» Мастоўскага раёна дзве з палавінай тысячы гектараў заняты пад шматгадовыя паліўныя сенакосы. Тут працуюць дажджавальныя ўстаноўкі «Днепр» і «Валжанка». Гэта дапамагае значна павялічыць ураджай траў на лугах.
НА ЗДЫМКУ: дажджавальная ўстаноўка «Днепр» на паліўных лугах.

● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ● ФАКТЫ ● ПАДЗЕІ ● ЛЮДЗІ ●

АБ ЗДАРОЎІ, АДУКАЦЫІ, ЖЫЛЛІ, АДПАЧЫНКУ КЛАПОЦІЦЦА ДЗЯРЖАВА

КОЛЬКІ КАШТУЕ ТОЕ, ШТО БЯСПЛАТНА?

Не так ужо многа рэчаў у свеце, якімі чалавек можа карыстацца бясплатна. Некаторыя спецыялісты, напрыклад, лічаць, што для эфектыўнай барацьбы з забруджваннем атмасферы трэба ўстанавіць цану нават на чыстае паветра. Што ж датычыць матэрыяльных даброт і паслуг, то тут пытанне даўным-даўно вырашана: за ўсё трэба плаціць. Другое пытанне — з чыёй кішэні?

Вось тыповы вынік нетыповай гісторыі: малады рабочы нечакана занядужыў. Урач гаспіталізаваў яго. Праляжаўшы каля паўгода, хворы так і не змог устаць на ногі. Тады мясцовыя ўрачы накіравалі яго ў спецыялізаваную клініку, дзе яму зрабілі складаную аперацыю. Хірургічнае ўмяшанне завяршылася паспяхова, і праз месяц Васіль Карніенка (так звалі хлопца) выйшаў з бальніцы з прадпісаннем прайсці курс санаторнага (аднаўленчага) лячэння.

У іншых сацыяльных умовах такое працяглае і складанае лячэнне запатрабавала б немалых расходаў. Васілю ж на працягу ўсяго гэтага часу не толькі не давялося плаціць за медыцынскае абслугоўванне, але яму па бальнічнаму лісту выплачвалася сярэднемесячная заработная плата, захоўвалася за ім і рабочае месца. Двое малалетніх дзяцей Карніенкі днём знаходзіліся пад наглядам выхавацеляў у яслях, прычым, улічваючы сітуацыю, бясплатна, хоць звычайна за паслугі дзіцячых садоў і ясляў у СССР бацькі плацяць прыкладна пятую частку іх кошту. Што ж датычыцца лячэння, то ўсе яго віды ў СССР, у тым ліку і складаныя аперацыі, бясплатныя. Расходы па ахове здароўя насельніцтва поўнасцю бярэ на сябе дзяржава. Кожны год з яе бюджэту на гэтыя мэты выдзяляецца звыш 15 мільярдаў рублёў.

Не давялося Васілю плаціць і за санаторнае лячэнне. Пуцёўкі ў дамы адпачынку і санаторыі ў СССР у большасці сваёй прадастаўляюцца за трэць іх поўнага кошту. А 10 працэнтаў — увогуле бясплатна. Асноўныя расходы ў гэтай галіне кампенсуюцца з фонду сацыяльнага страхавання і прафсаюзных сродкаў. Прычым фонд сацыяльнага страхавання фарміруецца не з адлічэнняў з заработнай платы рабочых і служачых, а са сродкаў дзяржбюджэту і прыбытку прадпрыемстваў. Адзначым, што кошт поўнага курса санаторнага лячэння складае 140—160 рублёў.

У бюджэце савецкай сям'і не прадугледжаны і расходы на адукацыю, хоць гэта не значыць, што ніхто яе не аплачвае. Гадавы расход на навучанне аднаго школьніка складае 180 рублёў, студэнта вышэйшай навучальнай установы — 1000. У сувязі з удасканаленнем навучання затраты дзяржавы на гэтыя мэты з кожным годам растуць. Сёння яны дасягаюць 40 мільярдаў рублёў.

Апрача бясплатных для насельніцтва аховы здароўя і адукацыі, у СССР цэлы шэраг паслуг прадастаўляецца насельніцтву на льготных умовах. Аб некаторых з іх ужо ўпаміналася: гэта ўтрыманне дзяцей у дзіцячых садах і яслях, санаторнае лячэнне. Да іх варта дадаць і льготныя ўмовы здачы ў арэнду насельніцтву дзяржаўнага жылля. Як вядома, у СССР жыллёвым будаўніцтвам займаецца ў асноўным дзяржава. Яна арганізуе і фінансуе будаўнічую справу, а кватэры здае ў наём, можна сказаць, за сімвалічную плату: 2—3 працэнты ў бюджэце сям'і. Прычым, умовы арэнды такія, што дзяржаўнае жыллё, па сутнасці, становіцца ўласнасцю сям'і, паколькі можа пераходзіць, нібы ў спадчыну, ад бацькоў да дзяцей і ўнукаў. Калі для сям'і дзяржаўная кватэра абыходзіцца нядорага, то для дзяржавы — гэта адзін з самых вялікіх артыкулаў расходаў. У жыллёвую праграму яна кожны год укладвае да 18 мільярдаў рублёў, плюс яшчэ 6 мільярдаў — датацыя на ўтрыманне жылога фонду: паступленні ад кватэрнай платы толькі на адну трэць пакрываюць эксплуатацыйныя затраты.

Па льготных цэнах у СССР рэалізуюцца тавары дзіцячага асартыменту (штогадовая датацыя дзяржавы ў гэтую сферу перавышае мільярд рублёў), некаторыя прадукты харчавання першай неабходнасці. Тое ж самае можна сказаць і аб кошце паслуг грамадскага транспарту, відовішчных устаноў. Усяго толькі за 30 капеек (гадавы ўзнос) любы чалавек можа ўступіць ў члены аднаго з многіх добраахвотных спартыўных таварыстваў і без абмежавання карыстацца інвентаром і вельмі развітай у краіне спартыўнай базай. У СССР не трэба рабіць папярэднія ўзносы ў лік будучай пенсіі.

Як бачым, бясплатнымі або льготнымі ў СССР з'яўляюцца тыя матэрыяльныя даброты і паслугі, даступнасць якіх, з савецкага пункту гледжання, не павінна залежаць ад фінансавых магчымасцей сям'і. Савецкая дзяржава зацікаўлена ў тым, каб усе людзі былі здаровымі, адукаванымі, мелі дах над галавой, маглі добра адпачыць. Словам, каб пачуццё сацыяльнага аптымізму было ўласціва не выбраным, а ўсім.

Аляксандр ДЗЕДУЛ.

РАБОЧЫ І МАДЭРНІЗАЦЫЯ ВЫТВОРЧАСЦІ: ВАРОЖАСЦЬ ЦІ САЮЗ?

ХАДА НАСУСТРАЧ

Мінскі аўтамабільны завод — адно з буйнейшых у СССР прадпрыемстваў, якое выпускае вялікагрузныя аўтамабілі амаль дваццаці мадыфікацый. Кожныя 3—4 гады на канвеер ставіцца новая, больш дасканалая мадэль. Вядома, гэта патрабуе мадэрнізацыі вытворчасці, на якую штогод завод траціць больш за 100 мільёнаў рублёў. Дзякуючы рэканструкцыі выпуск грузавікоў з году ў год павялічваецца.

Але як мадэрнізацыя адбіваецца на становішчы рабочых? Задаю гэтае пытанне дырэктару завода Івану ДЗЕМІНУ. Ён выказваецца катэгарычна:

— Адбіваецца станоўча абсалютна на ўсіх баках жыцця. Перш за ўсё — паляпшаюцца ўмовы працы. На новым абсталяванні лёгка і прыемна працаваць. Рэканструкцыя, дазваляе прывесці ў адпаведнасць з нормамі ўзровень шуму, вібрацыі, палепшыць паветранае асяроддзе. На выкананне мерапрыемстваў па ахове і паляпшэнню ўмоў працы за апошнія тры гады зрасходавана больш мільёна рублёў. Мы лічым надзвычайным здарэннем кожны выпадак вытворчага траўматызму і прафесійнага захворвання.

У рабочых няма падстаў дрэнна ставіцца да мадэрнізацыі хоць бы таму, што яна не пазбаўляе іх работы, як здараецца ў капіталістычных краінах. Кажу гэта, бо ведаю з уласных назіранняў. Любы аўтамат на вытворчасці там накіраваны супраць рабочага. У нас жа вытворчасць пастаянна патрабуе спецыялістаў. Скарачаючы колькасць людзей на адным участку, мы пераводзім іх на другі. Асвоіць новую спецыяльнасць дапамагаюць шасцімесячныя курсы, дарэчы — бясплатныя. У той жа час рабочы не губляе ў заработку — сярэдняя аплата працы на заводзе з году ў год расце.

Але плата за працу — не адзіны паказчык забяспечанасці чалавека. На заводзе ёсць фонды грамадскага спажывання, якія растуць прапарцыянальна павелічэнню прыбытку прадпрыемства. На гэтыя грошы (прыкладна 11,5 мільёна ў год, што складае каля 10 працэнтаў ад усіх капіталаўкладанняў на тэхнічнае пераазнашчэнне) мы будуем базы адпачынку, сталовыя, спартыўныя і дзіцячыя дашкольныя ўстановы, інтэрнаты, санаторыі-прафілакторыі, бальніцы. Свае здраўніцы мы маем не толькі ў Беларусі, але і на беразе Чорнага мора, у Карпатах. На ўвесь Савецкі Саюз славуты наш Палац культуры і тэхнікі, дзе працуюць дзесяткі гурткоў, студый, секцый.

Акрамя таго, вядзём вялікае жыллёвае будаўніцтва. За апошнія тры гады палепшылі жыллёвыя ўмовы больш чым тры тысячы сем'яў. Каб аператыўна аказваць людзям медыцынскую дапамогу, створана медыка-санітарная часць з дзвюма паліклінікамі на 1 040 наведванняў у суткі, сеткай здраўпунктаў у цэхах, расшырана стаматалагічная паліклініка. На чарговую, адзінаццатую пяцігодку намечана ўзвесці новыя інтэрнаты для моладзі, рэканструяваць футбольны стадыён, адкрыць новыя санаторый, бальніцу-стацыянар на 600 ложкаў.

Выдзеліць больш сродкаў на такія сацыяльныя патрэбы нам дапамагае ўсё той жа тэхнічны прагрэс. Так што рабочыя ў ім зацікаўлены, з пасіўных назіральнікаў становяцца яго актыўнымі прыхільнікамі. Новае абсталяванне, складаныя тэхналагічныя цыклы, высокі клас дакладнасці — усё гэта прад'яўляе строгія патраба-

гарызонты навукі

ПАРАДОКСЫ ГЕНЕТЫКІ

На тры пакаленні наперад можна прагназіраваць уласцівасці гібрыдаў пры вывядзенні новых сартоў сельскагаспадарчых культур. Такая магчымасць у селекцыянераў з'явілася дзякуючы метаду асацыіраванага адбору, прапанаванага вучонымі Інстытута генетыкі і цыталогіі АН БССР. Выкарыстанне навінкі дазваляе даследчыкам эканоміць гады каштоўнага часу, значна скарачае тэрміны селекцыі.

Вучоныя прыйшлі да высновы, што сёння, калі прадукцыйнасць сорта ўжо нельга павысіць намнога, традыцыйны адбор па адной з прыкмет, напрыклад, па ўтрыманню бялку, не заўсёды дае жадаемы вынік. Бо ўзмацненне гэтай якасці можа пайсці на шкоду іншым характарыстыкам, і тады сорт атрымаецца няўстойлівым.

Таму было вырашана ўлічваць адразу некалькі важнейшых прыкмет. Задача аказалася надзвычай складанай, бо ў такім выпадку неабходна суміраваць утрыманне бялку, крухмалу з ураджайнасцю, плошчай лісця, даўжынёй сцяблоў, вагой зерняў і многімі іншымі паказчыкамі. Але ўсё гэта вымяраецца ў працэнтах, квадратных метрах, сантыметрах, грамах — велічынях зусім несумяшчальных. Таму, перш чым скласці праграму для ЭВМ, вучоныя распрацавалі матэматычную мадэль, якая дазваляе на падставе адзінай колькаснай меры выбіраць лепшыя расліны або сем'і.

Цікава, што пры гэтым выбар можа выпасці не на самую падыходзячую па асноўнаму паказчыку расліну. Так, напрыклад, здарылася пры вывядзенні новага сорту цукровых буракоў беларускай селекцыі. Мутанты, якія далі пачатак новаму сорту, утрымлівалі менш цукру, чым іншыя караняплоды. І ўсё ж, як гэта ні парадаксальна, перавага была аддадзена ім.

Такое рашэнне вучоныя прынялі пасля аналізу ўстойлівасці раслін да шкоднікаў і хвароб, рэакцыі іх на ўгнаенні, тэхналагічных якасцей караняплодаў. І не памыліліся. Плантацыі, засеяныя менш «цукровымі» буракамі, далі большы выхад прадукцыі. У выніку з поля атрымана і больш цукру.

З дапамогай прапанаванага вучонымі метаду атрыманы не толькі новы сорт буракоў у Беларусі, але і перспектыўныя гібрыды яравой пшаніцы, кукурузы, сланечніку, тытуню ў іншых рэспубліках. Цяпер генетыкі паспяхова прымяняюць навінку і пры вывядзенні новых высокапрадукцыйных парод свойскай птушкі.

НА АПЕРАЦЫЙНЫМ СТАЛЕ— БАКТЭРЫЯ

Ювелірную аперацыю ўдалося ажыццявіць вучоным Інстытута генетыкі і цыталогіі Акадэміі навук БССР. Яны ўвялі ў прыкарнявыя бактэрыі злакавых культур ген, што адказвае за працэс паглынання азоту з паветра. Да гэтага часу такой актыўнай здольнасцю валодалі толькі бабовыя расліны, злакавыя ж культуры могуць засвойваць з паветра 2—3 працэнты азоту.

Апрацаваныя бактэрыі здольны не толькі засвойваць атмасферны азот, але і актыўна вылучаць яго ў глебу. Пераход ад унясення азотных угнаенняў да засялення прыкарнявой сферы раслін гэтымі бактэрыямі дазволіць узняць ураджайнасць розных культур.

ЛАЗЕРЫ «Ў ТАБЛЕТКАХ»

Вучонымі Беларусі распрацаваны лазер размерам з запалкавы карабок — «Гном-2», які паклаў пачатак новаму тыпу квантавых генератараў. У ім няма лінз, люстраў: ролю традыцыйнай оптыкі выконвае кропелька арганічнага фарбавальніка. У адрозненне ад існуючых канструкцый новы прыбор можа імгненна змяняць даўжыню хвалі выпраменьвання, генерыраваць у адной успышцы адразу некалькі частот. «Гном-2» танны, просты і надзейны. За гэтыя якасці ён удастоены залатога медаля на міжнародным Лейпцыгскім кірмашы 1980 года.

Новы тып лазераў можа быць выкарыстаны пры стварэнні хутка дзеючых светлавых ЭВМ, прыбораў для дыстанцыйнага кантролю асяроддзя. Памеры лазераў, на думку спецыялістаў, могуць быць зменшаны да велічыні звычайнай таблеткі.

МЕТАМАРФОЗЫ ТОРФУ

Безадходную тэхналогію ператварэння торфу ў высакаякасныя матэрыялы прапанавалі беларускія вучоныя. Яны стварылі абсталяванне, якое пры поўным выкарыстанні сыравіны дазваляе атрымліваць адначасова да дзесяці відаў прадукцыі. Сярод іх кармавыя дрожджы, аргана- мінеральныя ўгнаенні, воск. Адходы перапрацоўкі торфу ідуць на вытворчасць вугляродных фільтраў для тонкай ачысткі паветра і вадкасцей.

Выдатных поспехаў у працы дасягнуў калектыў Бабруйскага рачнога порта. З пачатку пяцігодкі ім перапрацавана дадаткова да плана 1 270 тысяч тон народнагаспадарчых грузаў і перавезена 433 тысячы тон пяску, гравію, лясных матэрыялаў і прамысловага абсталявання. Бабруйскія рачнікі сталі пераможцамі працоўнага спаборніцтва ў краіне.

НА ЗДЫМКАХ: у Бабруйскім рачным порце; ветэран працы механік І. ГУРЛАЙ; капітан-настаўнік порта А. РОГАЎ (справа) вядзе гутарку з экіпажам цеплахода капітанам-механікам Л. ЧАЙКОЎСКІМ, рулявым-матарыстам В. ДРАЗДОМ і першым памочнікам капітана В. БАРЫСЕВІЧАМ.

Фота А. НІКАЛАЕВА.

ванні да кваліфікацыі, адукаванасці. Людзі пайшлі вучыцца, каб атрымаць кваліфікацыю, адпаведную новаму ўзроўню вытворчасці. У раёне завода дзейнічае 12 агульнаадукацыйных сярэдніх школ, пазменная сярэдняя школа рабочай моладзі, аўтамеханічны тэхнікум з вячэрнім аддзяленнем, 2 прафесійна-тэхнічныя вучылішчы, філіял інстытута павышэння кваліфікацыі спецыялістаў аўтамабільнай прамысловасці, школы майстроў, гадавыя курсы тэхнікаў-наладчыкаў і інш.

Цяпер удзельная вага рабочых, занятых высокакваліфікаванай і кваліфікаванай працай, складае амаль 80 працэнтаў.

Вядома, завод вельмі зацікаўлены ў такіх работніках. Дарэчы, яны патрэбны і для папаўнення інжынернага саставу, прычым пераход з «ніжняга» ў «верхні» эшалон заводскай іерархіі — з'ява ў нас звычайная. Станіслаў Паршын пачынаў у 1953 годзе стругальшчыкам і вырас да намесніка генеральнага дырэктара «БелаўтаМАЗа». Наладчыкам механаапрацоўчых станкоў прыйшоў на завод Міхаіл Лаўрыновіч. Цяпер ён тэхнічны дырэктар аб'яднання. У свой час добрым зваршчыкам прэсавага цэха зарэкамендаваў сябе Рыгор Мартыненка — цяперашні намеснік галоўнага канструктара...

— Ці трэба разумець у такім выпадку, што паміж дырэкцыяй завода і рабочымі існуе поўная гармонія...

— Інтарэсы ў нас, сапраўды, адны. Але жыццё ёсць жыццё — яно раз-пораз ставіць праблемы, якія трэба вырашаць. Могуць быць цяжкасці, а часам і памылкі, напрыклад, працоўныя канфлікты. У гэтых выпадках інтарэсы рабочых абараняе прафсаюз. У цэхах створаны спецыяльныя камісіі па працоўных спрэчках. Яны складаюцца з роўнай колькасці прадстаўнікоў адміністрацыі і прафсаюза.

Быў, скажам, такі канфлікт. Мыйшчыцу дэталей Ганну Тарлецкую перавялі на адзін месяц маляром на замену хворага работніка. Жанчына згадзілася. А ў канцы месяца высветлілася, што яе заработная плата аказалася ніжэйшай, чым на ранейшай рабоце. Тарлецкая звярнулася да адміністрацыі цэха з просьбай даплаціць да сярэдняга заработку мыйшчыцы дэталей, як прадугледжвае ў падобных выпадках артыкул 26 Кодэкса законаў аб працы БССР. Адміністрацыя адмовілася. Жанчына напісала заяву ў камісію па працоўных спрэчках, якая і абавязала адміністрацыю цэха заплаціць.

У аснове працоўных канфліктаў ляжыць парушэнне альбо дзеючага працоўнага заканадаўства, альбо правілаў унутранага працоўнага распарадку прадпрыемства. Але такіх супярэчнасцей становіцца ўсё менш. У 1977 годзе цэхавымі камісіямі было разгледжана 125 спрэчак, у 1978 — 103, у 1979 — 73. Зніжэнне тлумачыцца больш старанным кантролем за захаваннем заканадаўства аб працы і яго бяспецы з боку заводскай прафсаюзнай арганізацыі.

— Ці не падрывае гэта аўтарытэт дырэкцыі? Як адзінаначалле дырэктара спалучаецца з правамі прафсаюзаў?

— Мне належыць права і абавязак арганізоўваць усю работу прадпрыемства, і я нясу адказнасць за яго дзейнасць. Без чыёй-небудзь даверанасці мне належыць дзейнічаць ад імя завода, прадстаўляць яго ва ўсіх установах і арганізацыях, у адпаведнасці з законам распараджацца маёмасцю і сродкамі, выдаваць даверанасці, адкрываць у банках разліковыя і іншыя рахункі прадпрыемства.

Але межы кампетэнцыі — паняцце адноснае. Нельга быць кампетэнтным ва ўсім, што падносіць кожную мінуту шматграннае заводскае жыццё. Вось тут на дапамогу і прыходзяць прафсаюзы, калектыўны розум. Па-першае, узгадняючы з яго прадстаўнікамі пытанні вытворчасці, застрахоўваеш сябе ад памылкі, а значыць, умацоўваеш свой аўтарытэт, а не губляеш яго. Па-другое, рабочым (99,9 працэнта іх знаходзіцца ў прафсаюзе) прадастаўляецца шырокая магчымасць кіраваць вытворчасцю, унікаць у яго тонкасці. Такім чынам выхоўваецца пачуццё адказнасці за агульную справу. Гэта ж выдатна! Што б ні абмяркоўвала дырэкцыя — пытанні планавання, размеркавання фондаў, аховы працы, тэхнікі бяспекі, працы і заработнай платы і гэтак далей, — яна робіць гэта па ўзгадненню з прафсаюзным камітэтам.

Акрамя таго, два бакі штогод заключаюць пагадненне, якое мае сілу закона, — калектыўны дагавор. У ім агаворваюцца мерапрыемствы па паляпшэнню ўмоў працы і быту рабочых. Дагавор змацаваны двума подпісамі — дырэктара завода і старшыні заўкома. Гэта не акт недавер'я адзін да аднаго. Гэта форма садружнасці, узаемнай павагі, сведчанне сапраўды дэмакратычнага стылю кіравання вытворчасцю.

Гэты спрыяльны працэс таксама звязаны з ростам адукаванасці рабочых, складанасцю сучаснай тэхнікі, прадукцыйнасць якой абмяжоўваецца, калі работнік рэагуе толькі на знешнія каманды. Рабочы — творца, а не выканаўца. Гэта формула ляжыць у аснове і сацыялістычнай дысцыпліны працы. Свядомыя, зацікаўленыя адносіны да працы, якія выключаюць безгаспадарчасць, не выхаваеш крыкам, голай сілай, прыніжэннем чалавечай годнасці...

— Што было адной з самых цяжкіх, на ваш погляд, праблем, якія давялося вырашаць у працэсе рэканструкцыі завода?

— Бадай, гэта праблема галоўнага канвеера. Асноўная прыкмета любога канвеера (ад чаго ён заўсёды знаходзіцца ў супярэчнасці з тым, хто на ім працуе) — гэта тэмп. Ён звычайна вызначаецца псіхафізічнымі магчымасцямі чалавека, і вядома ж, планам прадпрыемства.

На Мінскім трактарным заводзе, напрыклад, рытм канвеера разлічаны на 4,4 мінуты, а каб выканаць праграму завода, часу трэба менш — 3,16 мінуты. Значыць занятасць рабочага ў тэмпе канвеера складае 60—70 працэнтаў. Гэта гуманна: чалавек не так стамляецца.

Мы ж вырашылі пазбавіцца ад манатоннасці канвеера іншым спосабам: зрабілі яго не тэмпавым, а арганізацыйным. Наша галоўная транспартная стужка вельмі кароткая, усяго некалькі метраў. На ёй змяшчаюцца дэталі і вузлы ўсяго некалькіх машын, прытым — розных мадыфікацый. Гэта робіць працу зборшчыка больш разнастайнай, менш стамляючай. Калі зборка закончана (на гэта можа спатрэбіцца 10—15 мінут), рабочы сам адсылае стужку далей, на суседні ўчастак. У час зборкі ён можа перайсці на іншае месца, дапамагчы таварышу, памяняцца з ім аперацыяй — увогуле арганізоўваць работу так, як зручна яму.

Па-мойму, гэта лепш, чым метад, прыняты на некаторых шведскіх заводах, дзе машыны збіраюць на казлах. Там усё-такі захоўваецца адчуванне тэмпу. У нас жа чалавек не падпарадкоўваецца яму, а толькі сабе. Усё гэта запатрабавала карэннай перабудовы тэхналогіі, дадатковага будаўніцтва, вырашэння мноства розных пытанняў.

Інтэрв'ю запісаў Юрый САПАЖКОЎ.

на зямлі бацькоў

ДОМА

За дзвярамі ў адказ на мой званок пачуліся хуткія, гучныя крокі, і я чамусьці падумала, што, напэўна, сын Сяргея Васільевіча Ігар, які прыязджаў на дзень нараджэння бацькі, усё яшчэ гасцюе ў яго. Але мяне сустрэў сам гаспадар, і я зноў здзівілася, як мала ён змяніўся за тыя гады, што мы з ім не бачыліся. Я сказала яму пра сваё ўражанне, Сяргей Васільевіч толькі ўсміхнуўся:

— Так ужо і не змяніўся! Роўна чатыры дні назад 85 стукнула!

85 гадоў...Амаль палавіна з іх пражыта ў Злучаных Штатах Амерыкі, дзе яму, як і амаль кожнаму эмігранту, давялося зведаць нямала нягод і гора. Толькі адно ў біяграфіі Сяргея Афанасьева той пары не зусім звычайнае: ён быў змагаром. У Сан-Францыска сябры называлі яго Джордж Вільямс. Разам з імі ён змагаўся за правы прыгнечаных. У гады другой сусветнай вайны працаваў у часопісе, дзе расказвалася аб справядлівай барацьбе савецкага народа, удзельнічаў у зборы сродкаў для Савецкага Саюза.

Пасля перамогі над фашысцкай Германіяй для Сяргея Афанасьева не існавала пытання — ехаць ці не ехаць дадому. Жывучы на чужыне, ён заставаўся гарачым патрыётам Радзімы, радасці роднага народа былі яго радасцямі, а агульнае гора — і яго горам. Засмучала і палохала толькі адно: ці знойдзе ён у гэтай разбуранай, разрабаванай ворагам краіне сваіх блізкіх. Да вайны ў Мінску жыў брат, недзе ў Прыбалтыцы згубіўся след сына.

Прагна лавіў Сяргей Васільевіч кожную вестачку з Радзімы. У Сан-Францыска ў магазіне, дзе гандлююць рускімі таварамі, можна было купіць рускія кнігі, часопісы, газеты. Там упершыню ён і ўбачыў газету «За вяртанне на Радзіму». Гэта было так нечакана і так радасна — вестка з роднага горада!

У тым жа магазіне, дзе купляў «За вяртанне на Радзіму», аднойчы трапіў у рукі Сяргею Васільевічу зборнік навуковых работ выкладчыкаў Беларускага політэхнічнага інстытута. Пад артыкулам стаяла прозвішча Афанасьеў і ініцыялы, як у брата. Без доўгіх разважанняў Сяргей Васільевіч напісаў на імя рэктара БПІ запытанне, і вельмі хутка ў адказ прыйшла тэлеграма ад брата. Мікалай Васільевіч запрашаў Афанасьева-старэйшага на пастаяннае жыхарства ў Мінск. Пісаў, што жыве ў вялікай кватэры і месца хопіць усім. Пісаў таксама і пра тое, што на старасці год брату будзе цяплей сярод блізкіх яму людзей.

Першы год, пражыты на Радзіме, Сяргей Афанасьеў лічыць самым шчаслівым у сваім жыцці. Тут яго чакала самая вялікая, самая поўная радасць — сустрэча з сынам Ігарам. Хлопчык нарадзіўся ў 1929 годзе ў Чыкага, але бацька не мог пракарміць у той час сваю невялікую сям'ю. Жонка з сынам вымушана была пакінуць Злучаныя Штаты і паехала да сваіх родных у буржуазную Латвію.

У час вайны жонка Сяргея Васільевіча загінула. Што сталася з сынам, ніхто не ведаў. У «Голасе Радзімы», дзе Афанасьеў быў частым госцем пасля вяртання, яму параілі працягваць пошук, і літаральна праз тры тыдні ён ведаў, што Ігар жыве ў Рызе. Сустрэча была цёплай, сардэчнай. Праз 32 гады Сяргей Васільевіч упершыню пачуў слова «тата». Ён слухаў, верыў і не верыў, што ў рэшце рэшт так шчаслива склаўся лёс яго сына. «У Амерыцы такое магло б здарыцца толькі выпадкова», — сказаў Сяргей Афанасьеў.

Ігар многа перажыў пасля смерці маці. Ад угону ў Германію ратавалі яго, сірату, зусім чужыя, незнаёмыя людзі. Пасля вайны Савецкая ўлада дапамагла яму стаць адукаваным чалавекам. Ігар скончыў інстытут, мае цікавую работу. У яго цудоўная сям'я, растуць сын і дачка. З бацькам яны моцна, па-мужчынску сябруюць. Сяргей Васільевіч бывае ў Рызе ў сына. Бадай, ніводнага дня нараджэння бацькі Ігар не прапускае. Штогод прыязджае да яго ў Мінск, прывозіць падарункі, а самае галоўнае: Сяргей Васільевіч не адчувае сябе адзінокім. У яго ёсць сын, ёсць блізкія людзі.

Усімі сваімі навінамі Афанасьеў дзеліцца ахвотна. Ён ні разу не пашкадаваў, што вярнуўся ў Беларусь. Прыехаў сюды ён ужо немаладым чалавекам, яму адразу прызначылі пенсію — 91 рубель. У брата, хоць і меў той вялікую кватэру, жыў нядоўга. Атрымаў сваю, аднапакаёвую з выгодамі. Падабаецца яна Сяргею Васільевічу яшчэ і тым, што размешчана ў зручным месцы: на першым паверсе вялікі гастраном. Усё, што трэба, можна купіць, не адыходзячы далёка ад дому. Калі, бывае, прыхварэе ці зімой у галалёд і холад, старому чалавеку цяжка выходзіць на вуліцу, тады дапамагаюць суседзі.

— Мы вельмі дружна жывём. Суседзі і адзін аднаму дапамагаюць і мяне ніколі не забываюць. Адна суседка — медсястра. Калі трэба, укол зробіць, сусед адрамантуе, дзе што зламаецца. А найбольш я з дзецьмі сябрую, — расказвае Сяргей Васільевіч.

Яны прыносяць свае малюнкі, чытаюць яму кніжкі і нават, калі дазволіць, дапамагаюць у гаспадарцы.

Да ўрачоў Сяргей Васільевіч звяртаецца рэдка: яны рэгулярна прыходзяць самі. Чалавек у такім узросце абавязкова знаходзіцца пад медыцынскім наглядам. Вядома, усе іх клопаты і дапамога бясплатныя. Пра ўрачоў, пра уласнае здароўе Сяргей Васільевіч наогул, відаць, гаворку весці не любіць («Колькі адпушчана прыродай, столькі пражыву»). Значна ахвотней расказвае пра свае заняткі, інтарэсы («Люблю музыку»). У яго дамашняй фанатэцы 14 опер, многа іншых пласцінак («З задавальненнем чытаю. Менш, праўда, захапляюся белетрыстыкай. Аддаю перавагу такім кнігам, як, напрыклад, дакументы Нюрнбергскага працэсу»).

Такая цікавасць, мусіць, невыпадковая. У Сяргея Васільевіча свая думка наконт усяго, што адбываецца ў свеце. Яго хвалюе пытанне, хто стане чарговым амерыканскім прэзідэнтам. У мінулым годзе ён прыслаў нам агляд канадскага часопіса «Паўночны сусед», які выкрываў агрэсіўную палітыку ЗША на працягу ўсіх 200 гадоў іх існавання.

— Я добра памятаю, які шум узнялі амерыканскія газеты ў 1957 годзе. Здавалася, вось-вось пачнецца вайна. Але тут якраз Савецкі Саюз запусціў першы штучны спадарожнік. Усё сціхла. Год прайшоў — зноў неспакойна стала ў свеце. На гэты раз рускія запусцілі ў космас сабак, яшчэ праз некаторы час паляцеў Юрый Гагарын. Стала відавочна перавага Савецкага Саюза, і на зямлі надоўга наступіла зацішша. Думаю, што і цяпер мы здолеем даказаць, што вайна не лепшы сродак для ўзаемаразумення, што яна прынясе незлічоныя бедствы ўсім без выключэння народам свету.

Мы расталіся з Сяргеем Васільевічам, думаю, ненадоўга. Для яго «Голас Радзімы», па яго ж словах, так і застаўся сваёй, роднай газетай.

Дзіяна ЧАРКАСАВА.

ВІЗІТ ЗАМЕЖНЫХ ДЫПЛАМАТАЎ

Міністэрства замежных спраў СССР арганізавала азнаямленчую паездку кіраўнікоў дыпламатычных прадстаўніцтваў, акрэдытаваных у Савецкім Саюзе, у Беларускую ССР. Сярод прыбыўшых у Мінск дыпламатаў былі надзвычайныя і паўнамоцныя паслы Ісламскай Рэспублікі Маўрытанія, Рэспублікі Малі, Рэспублікі Коста-Рыка, Аб'яднанай Рэспублікі Камерун, Рэспублікі Заір, Мексікі, часовыя павераныя ў справах Рэспублікі Ліберыя, Рэспублікі Верхняя Вольта, Рэспублікі Сінгапур, Сірыйскай Арабскай Рэспублікі, Тагалезскай Рэспублікі, а таксама прадстаўнік пасольства Народнай Рэспублікі Балгарыі ў СССР.

Госці азнаёміліся з славутымі мясцінамі беларускай сталіцы, наведалі Мінскі трактарны завод, пабывалі ў калгасе «Новы быт» Мінскага раёна.

НА ЗДЫМКУ: замежныя дыпламаты на плошчы імя Леніна ў Мінску.

Фота Я. КАЗЮЛІ.



Баразняць воды Нарачы пасажырскія цеплаходы.

Фота А. КАЛЯДЫ.

ТОЛКАЮТ К КОНФРОНТАЦИИ С СОВЕТСКИМ СОЮЗОМ

ЧЬЮ ПРОГРАММУ ВЫПОЛНЯЕТ ДЖ. КАРТЕР?

Нынешняя внешнеполитическая линия Вашингтона в отношении СССР поразительно перекликается с той программой, которую провозгласил на конгрессе в Брюсселе в феврале 1976 года лидер Лиги защиты евреев раввин Меир Кахане.

В послании Кахане говорилось: «От имени Лиги защиты евреев я предлагаю следующую программу: 1) немедленное прекращение всех переговоров западных держав с СССР, включая переговоры по разоружению, космосу, культуре и торговле; 2) эмбарго на торговлю с Советским Союзом, делая упор на зерно и общий бойкот всех фирм, торгующих с СССР; 3) прекращение туристических поездок; 4) прекращение культурного и спортивного обмена; 5) приостановить участие Советского Союза в международных организациях, не допустить СССР к Олимпиаде-76; 6) запугивание советских официальных лиц за границей, пикетирование мест их жительства, организация телефонных звонков, создание помех в линиях связи советских посольств и консульств; 7) пикетирование и демонстрации у советских учреждений, чтобы ни одна неделя не проходила без них».

Тогда, в 1976 году, даже видавшая виды американская пресса квалифицировала эти призывы как провокационные. Но сейчас идеи фашиствующего раввина воплощаются в практику общественной жизни Соединенных Штатов. Активизировался сионистский террор против советских представителей. 11 декабря 1979 года раздался взрыв в советском представительстве при ООН в Нью-Йорке. В январе 1980 года бомба взорвалась в нью-йоркском агенстве Аэрофлота. За ним последовала серия грубых антисоветских выпадов властей США.

Картер заморозил ратификацию Договора ОСВ-2, отдал приказ о бойкоте московской Олимпиады, запретил поставки зерна в Советский Союз. В Вашингтоне было объявлено о бойкоте торгово-экономических, научных и культурных связей с Советским Союзом. Администрация США потребовала, чтобы западноевропейские партнеры Америки последовали этому курсу.

Отношения между Советским Союзом и Соединенными Штатами являются главной мишенью сионистов в их борьбе против нормализации обстановки в мире. Советско-американские связи рассматриваются как ключевой момент всего процесса разрядки напряженности, развитие которого может привести к размыванию политической базы сионистского капитала как в самой Америке, так и за ее пределами. Состояние «холодной войны» между СССР и США дает сионистским кругам возможность удерживать под своим идеологическим контролем значительные слои населения главной страны капиталистического мира, культивировать в ней ненависть и вражду к Советскому Союзу.

Капитал сионистов занимает прочные позиции в системе военно-промышленного комплекса США. Входящие в руководство «американского европейского комитета» братья Лазарус, например, контролируют авиакомпанию «Локхид», которая на 90 процентов работает на Пентагон. Твердые позиции занимают сионисты в корпорации «Дженерал дайнэмикс», производящей баллистические ракеты, крылатые ракеты, атомные подводные лодки и бомбардировщики. Этим объясняется активное участие сионистов в раздувании мифа о «советской угрозе», их выступления против разрядки, ограничения гонки вооружений, советско-американского Договора ОСВ-2.

Альфред Лилиенталь в своей книге «Тенета сионизма» раскрывает влияние крупного сионистского капитала на американское государство и его народ. Финансовые центры Уолл-стрита, пишет А. Лилиенталь, крупнейшие инвестиционные банковские дома, руководимые Гольдманом, Саксом, Куном, Лебом и К°, Лазарем Фрером, Лейманом Бразерсом, Соломоном Бразерсом, Лебом Роудесом и К°, играют огромную роль в финансировании современной монополистической Америки и оказывают громадное влияние на экономику страны. Все они отчисляют огромные суммы на деятельность сионистов — этого огромного политического спрута, охраняющего их классовые интересы.

Сионистский капитал установил прочный контроль за средствами массовой информации американского общества. Помимо собственных, сионистских органов печати в Америке, которые насчитывают 140 газет общим тиражом около 4 миллионов экземпляров, журналы «Хадаса», «Джуиш пресс», «Нэншл джуиш мансли», сионисты контролируют 70 процентов общенациональных периодических изданий США, 80 процентов всех телевизионных программ.

Эти могучие рычаги в массовой информации формируют общественное мнение американцев, манипулируют сознанием миллионов людей в направлении, выгодном сионистам. Они толкают американцев к конфронтации с Советским Союзом.

Б. АНТОНОВ.
(АПН).

пішуць землякі

НАША БЛАГОДАРНОСТЬ БЕСПРЕДЕЛЬНА

Дорогая Родина! Ты всегда в нашем сердце, ты всегда волнуешь нас своей красотой, ты всегда для нас тот родник, который дает нам силы жить и работать. Твой голос звучит для нас со страниц любимой газеты «Голас Радзімы», его мы ловим в эфире, мы искренне радуемся, когда видим на снимках родные пейзажи, города и деревни.

Этот год для тебя, любимая Отчизна, олимпийский! Как и всегда, желаем тебе самых выдающихся успехов во всех твоих делах, радуемся, видя, как велик твой престиж на международной арене.

В прошлом году мы снова побывали на Родине, на этот раз и в Минске. 24 дня провели у моря, в курортном городе Сочи. Лечили свой застарелый ревматизм. Принимали различные ванны, массаж, электропроцедуры, делали гимнастику. А наша внучка Патриция через день ездила в Мацесту на ванны. Все это, за исключением осмотра врачей, делалось нам бесплатно. А советские граждане не платят и за это. Послеобеденное время у нас всегда было свободным, и его мы использовали для купанья, прогулок. Гуляя, мы встречались с людьми со всех концов нашей планеты, особенно интересно было знакомиться с соотечественниками — с Дальнего Востока, Сибири, Урала, со всех концов необъятного Советского Союза. Со многими мы так сдружились, что когда пришлось прощаться, расставались с трудом, как будто впервые оставляем Родину.

Первый раз мы приезжали в Советский Союз 15 лет тому назад. Много это или мало? Смотря как к этому подходить. Вот мы, например, увидели те же города, ходили по тем же улицам и не узнавали их. Они так изменились, что невольно хотелось воскликнуть: «И когда же это все успели сделать?!» Так было с нами в Москве, Киеве, Сочи... Мы видели, как народ преображает природу, хозяйство, каких новых высот достигает культура. Это заметит даже малограмотный человек, если он каждый раз посещает концерты, спектакли и другие представления.

Ничего подобного в Канаде никогда не увидишь. Разве только, когда приезжают коллективы из Советского Союза. Да и тогда их видят те, кто живет в больших городах.

Из Сочи мы летели в Москву. В Адлере во время посадки на самолет обратили внимание на большую группу мальчиков и девочек, собиравшихся лететь вместе с нами. Они заняли места рядом. Как выяснилось, они возвращаются из Сочи, где отдыхали, в Магадан. Дети постарше, сказала нам руководительница, остались еще в Сочи. Они вечером дают концерт, а после этого будут выступать в Москве. Домой вернутся к началу школьных занятий. Мы подумали тогда: вот это действительно Год ребенка! И начался он 62 года назад, когда в России была провозглашена Советская власть. Мы много читали и слышали, немало сами видели за время поездок в СССР, как живут здесь дети. Но впервые столкнулись с тем, что государство самолетами за тысячи километров отправляет детей на отдых. Подобными привилегиями в капиталистическом мире пользуются только дети потомственных богачей, наследственных миллионеров, в карманах которых деньги, на стороне которых закон и само государство.

В Москве нас всех троих — меня, жену и внучку — приняли в научно-исследовательском институте. Профессор Насонов, другие опытные врачи проконсультировали нас самым внимательным образом, обследовали и прописали лекарства, дали множество полезных рекомендаций. И все это бесплатно. Наша благодарность беспредельна.

Ночью самолетом летим из Москвы в Минск. Нам забронирован номер в гостинице «Юбилейная», нас встречает представитель редакции газеты «Голас Радзімы». Мы дома!

Назавтра совершили экскурсию автобусом по Минску и его окрестностям, увидели его новостройки. Какой это прекрасный город! Жители по праву могут гордиться им. Вечером того же дня мы присутствовали на концерте артистов Белорусского государственного ансамбля песни и танца. Этот коллектив нисколько не уступает ранее нами виденным. И вновь мы в душе порадовались успехам многонационального советского искусства.

От Минска до Бреста ехали поездом. Нас в купе четверо. За минуту до отправления пришла наша попутчица. Быстро познакомились. Она оказалась учительницей из Гомеля. Ехала в гости к брату-инженеру в Жабинку. Мария Жедин (так звали нашу молодую попутчицу) только что окончила педагогический институт. В Гомеле ее ждали квартира и работа. Все это я объясняю внучке по-английски. А Мария, узнав, что внучка тоже учительница, тут же включилась в разговор по-английски. Когда же это такое было, чтобы дети крестьян владели не только своим родным, но еще и русским, и несколькими иностранными языками?!

В Жабинке мы распрощались с Марией, но и нам дальше не пришлось ехать поездом: нас встретили племянники и их дети и отвезли в деревню Здитово. Дальше все делалось так, как всегда в подобных случаях. Каждый приглашал к себе, старался угостить, приветить. Просто не было никакой возможности навестить всех. Ведь нам еще очень хотелось увидеть Брестскую крепость - герой, осмотреть весь мемориальный комплекс, показать Беловежскую пущу своей внучке. Волновались, что не успеем всюду, но племянники успокоили: «Не на лошадях же будете ездить, на машине всюду успеем». Я забыл сказать, что у наших родственников есть собственная машина.

И вот мы уже въезжаем в Беловежскую пущу. Дорога утопает в зелени лиственниц, впереди видим, как толпятся экскурсанты около живого зоологического музея, где содержатся обитатели заповедника — зубры, олени, тарпаны, лоси. До заката еще далеко, но высокие сосны закрыли солнце своими кронами, и потому быстро темнеет.

На обратном пути останавливаемся в Каменце. Здесь проживает мой двоюродный брат по матери, хотим его навестить. До нашей эмиграции Каменец представлял собой маленькое местечко с мелкой бакалейной торговлей и несколькими примитивными кустарными мастерскими. Теперь это город. Здесь есть современная школа, больница, промышленные предприятия, детские сады и ясли.

Вскоре мы нашли улицу Маяковского и постучали в дом к брату. Было и здесь угощение. Да какое! Беловежские белые грибы, жаренные в масле, домашняя колбаса, крупник, домашняя вишневая наливка и шампанское. За столом мне вспомнилось другое время, когда в бывшей Западной Белоруссии, если заезжали в гости, людей нечем было накормить, потому что каждый день был пост.

Побывали мы и в крепости-герое. Наверное, у всех людей здесь рождаются одинаковые мысли: какое страшное бедствие война, нужно приложить все силы, чтобы она больше никогда не повторилась!

Наше путешествие было очень полным и содержательным. Ведь мы с женой побывали еще и в своих родных деревнях Подречье и Хмелеве. Мы встретились, пожалуй, со всеми своими родственниками, увидели, как интересно и богато они живут. Поездка была увлекательной, незабываемой, радостной. Большое спасибо всем, кто помогал нам.

Надежда и Григорий МАРТЫНЮКИ.

Канада.

КАРЬЕРА МОЛОДОГО СОВЕТСКОГО ЧЕЛОВЕКА

ГОРЫ ТРУДА, КРУПИНКИ УДАЧИ

Анатолию Карповичу 33 года. По его словам, это пока ещё та часть жизни, когда полезнее слушать, чем говорить. И все же он не совсем следовал этому правилу. За каких-нибудь десять лет «сказал» на редкость много. Согласитесь: иметь в столь ранние годы 31 авторское свидетельство на изобретения, степень кандидата наук (им стал в 28 лет), звание лауреата Государственной премии БССР и стать заместителем главного инженера крупного производственного объединения — это немало. Были дни, недели, когда он забывал обо всем, кроме своего дела.

Но если б он не был таким, как есть, то был бы, очевидно, как другие. Скажем, в выходной, не возражая жене, брал бы сыновей и шел на пляж. Тем более, Неман у порога. А он, сказав ей традиционное «на минутку», уходит на встречу молодых специалистов.

Почему он так живет и как относятся к нему окружающие? Это мне и хотелось выяснить...

В одном издании, предложенном мне Анатолием Карповичем, я прочел: «Гродненское производственное объединение «Азот» — одно из крупнейших предприятий страны по производству азотных удобрений и капролоктама. Обеспечивает минеральными удобрениями сельское хозяйство Белоруссии и республик Прибалтики, капролоктамом — заводы искусственного волокна западных районов СССР, экспортирует капролоктам на мировой рынок.

Предприятие оснащено современным технологическим оборудованием. На нем действует автоматизированная система управления производством. Благодаря высокой автоматизации технологических процессов и механизации трудоемких работ оно еще в 1971 году по производительности труда вышло на первое место среди предприятий азотной промышленности в СССР...»

Невольно подумалось: «На таком предприятии молодой инженер быстро растет как специалист. Но без таланта здесь не обойтись...»

Да, продвигался он стремительно. Приехал в Гродно на «Азот» по распределению, окончив Белорусский технологический институт в 1969 году, и начал работать инженером проектно - конструкторского отдела. Затем стал старшим инженером, руководителем сектора, заместителем начальника исследовательской лаборатории, начальником лаборатории и в 1978 году — заместителем главного инженера. Только ли талант определил его быструю карьеру?

Вырос Анатолий Карпович в городе Березино Минской области. Скромный достаток в семье ориентировал Анатолия в самом раннем возрасте на главное— упорный труд. После восьми классов пошел работать, а учебу продолжал в вечерней школе. Выбор определился сам собой: склонность имел к математике, физике, химии. А тот факт, что до Анатолия технологический институт окончили братья, поставил последнюю точку.

Анатолий и его жена Лариса — земляки, ровесники. Недавно они отметили 18-летие своего знакомства, а женаты они уже 15 лет. Олег родился, когда Анатолий был на третьем курсе, Лариса тоже была студенткой — училась в Минском радиотехникуме. А выросла в семье, где было семеро детей. Свою семью создали, когда супругам вместе не было и 40 лет.

— Толя работал так много, что я боялась за его здоровье... — с необыкновенной душевностью, теплотой вспоминает Лариса. — Конструировал, чертил... Бывало, ходил разгружать вагоны. Делал все, чтобы обеспечить нас, и успевал!

При распределении после окончания института ему предложили Гродно.

На вопрос, как он объясняет свою карьеру, Карпович сказал: «Девяносто девять процентов труда и один процент удачи...» С такой одержимостью он работал и над массообменным аппаратом, который принес предприятию 300 тысяч рублей экономии в год.

Карпович не относит себя к «генераторам» идей. Но поиску отдается самозабвенно. Поддерживает коллективные усилия. Почему?

— Потому что время одиночек безвозвратно ушло. Сегодня над решением любой задачи на производстве работают коллективы, и идея именно в такой обстановке может получить верное, быстрое развитие. В «чистой» науке индивидуальный поиск, возможно, оправдан, а на производстве нет.

Так считает молодой ученый, который стал полпредом науки в производственных цехах. Он и диссертацию написал и защитил, не отрываясь от работы, поступив заочно в аспирантуру.

— Для меня каждый успех в жизни, — говорит он, — как та вершина в горах, с которой открываешь еще более высокую и которую хочется покорить...

Самой большой радостью Анатолий считает тот миг, когда можно выкроить минутку и повозиться с трехлетним Иваном, младшим сыном, который неожиданно быстро завоевал репутацию «хозяина» в доме. Обычно взрослым, в том числе и Олегу, для этого не хватает времени. У Олега скоро союзные соревнования, у мамы тоже забот много: в семье двое сыновей и вечно занятый делами муж! А ведь к этому ещё и работа—Лариса инженер.

* * *

Эти заметки о преуспевающем молодом человеке могут вызвать вопрос: мол, таких мало, да и что, собственно, он имеет от этого?

Именно таких, как Карпович, действительно мало, зато много похожих. Молодых, одержимых в труде и поиске. В том же Гродно я познакомился с тридцатилетним заместителем начальника областного управления строительного банка Владимиром Наварко, такими же молодыми — заместителем начальника по производству одного из заводов Владимиром Герасименко, кандидатом медицинских наук Сергеем Зиматкиным и другими. Каждый из них неповторим в своей человеческой индивидуальности, и всех их роднит вот что: широкие возможности, которые предоставляет им общество для проявления творческого дарования.

Что же они имеют? Например, Анатолий Карпович имеет четырехкомнатную государственную квартиру, его зарплата составляет 450 рублей в месяц. Семья живет в том достатке и комфорте, которому позавидует даже респектабельный американец. Но это, как заметил Анатолий Карпович, не цель, а всего лишь следствие.

Георгий ПАВУЛЯ.

У Мінску адкрыўся новы спецыялізаваны магазін фотатавараў «Кадр».
Фота Я. КАЗЮЛІ.

«ШТУРМУЙЦЕ БУДУЧЫНІ АВАНПОСТЫ...»

ДА 80-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ УЛАДЗІМІРА ДУБОЎКІ

Словы, вынесеныя ў загаловак, гучаць, як запавет.

Думаючы пра Уладзіміра Мікалаевіча Дубоўку, успамінаю радкі В. Жукоўскага

О милых спутниках, которые наш свет
Своим сопутствием для нас животворили,
Не говори с тоской: их нет,
Но с благодарностию: б ы л и.

Сапраўды, без Дубоўкі нельга ўявіць нашу паслякастрычніцкую паэзію, нашу сучасную літаратуру. Ён ніколі не быў пачынаючым паэтам: у літаратуру на пачатку 20-х гадоў увайшоў адразу, голасна і яскрава. Паэты старэйшага пакалення сваім далучэннем да паэзіі ў роўнай ступені абавязаны нашым класікам і Уладзіміру Дубоўку. Сярод самадзейнага маладнякоўскага рознагалосся вершы Дубоўкі вылучаліся паглыбленасцю думкі, свежасцю пачуцця, дасканаласцю формы і арыгінальным моўным багаццем.

Сапраўды, дзіўна: першая імперыялістычная вайна адарвала юнага Дубоўку ад роднай глебы, а ён на ўсё жыццё застаўся верны свайму краю, беларускай культуры і роднаму слову, ды якому! Каларытнаму, свежаму, вобразнаму і пявучаму. Калі яго спыталі, як гэта ён, ніколі не вывучаўшы беларускую мову, так яе добра ведае, паэт растлумачыў: «Як жа яе не ведаць, калі яна родная! Як жа яе не любіць, калі яе стваралі на працягу вякоў твае продкі, гаварылі на ёй, перадалі табе ў спадчыну, як самы вялікі скарб свой».

На самым пачатку нашай паслярэвалюцыйнай дзяржаўнасці Уладзімір Дубоўка як працяг Купалавай веры: «Занімай, Беларусь маладая мая, свой пачэсны пасад між народамі», пісаў:

Выдзьме ўвесь попел, як ворага вецер,
Выжане рабскую кроў і пакору.
Зойме айчына пасад свой у свеце,
Заўтра не будзе падобна на ўчора.

Усё так і збылося. А малады Дубоўка, поўны невычэрпных сіл і імпэту, працаваў у многіх установах Масквы, вучыўся ў літаратурным інстытуце імя Брусава, выдаваў у Мінску першы дзіцячы часопіс, палымяна выступаў на дыспутах і ў друку, здзіўляў і радаваў чытачоў новымі публікацыямі і нечаканымі па арыгінальнасці і свежасці кнігамі «Строма», «Там, дзе кіпарысы», «Трысцё», «Наля», «Credo».

Як словы прысягі Радзіме з вуснаў у вусны перадаваліся Дубоўкавы радкі:

О Беларусь, мая шыпшына,
Зялёны ліст, чырвоны цвет!
У ветры дзікім не загінеш,
Чарнобылем не зарасцеш.

Не загінула! Не зарасла ў гадзіну ліхалецця і пакутаў, выстаяла разам з усімі ў братнім Саюзе і яшчэ вышэй узняла свой чырвона-зялёны сцяг з руін і полымя адроджаная Рэспубліка.

Дубоўка заўсёды быў скіраваны ў будучыню, верыў у гістарычную місію свайго народа, роднага краю з гордым імем Савецкая Беларусь.

У час нялёгкі выйшлі мы ў дарогу,
Кагорту нашу ксцілі навальніцы.
Байкушы розныя ўздымалі скогат, —
Імкнуліся прымусіць нас спыніцца.
А мы ішлі з імпэтам віратлівым,
А мы ішлі няспынна і упарта.
І пурпуровых ветразей узвівы
Трымалі курс на сонечнае заўтра.

Гэта з паэмы «І пурпуровых ветразей узвівы». Пазней Дубоўка ўспамінаў: «Яшчэ ў 1926 годзе я задумаў напісаць тры паэмы, у якіх, паводле магчымага, адлюстраваць пераход нашае, пераважна сялянскай краіны да вышэйшых форм жыцця — да калектывізацыі, да індустрыялізацыі».

Паэт ніколі не вырашаў жыццёвыя і творчыя праблемы па-лабавому просталінейна, дэкларацыйна і павярхоўна. Яго наватарскія заглыбленыя пошукі не разумелі некаторыя, так званыя, крытыкі. На неапублікаваную паэму «Штурмуйце будучыні аванпосты» з'явіліся разгромныя, падобныя на даносы артыкулы. У той яшчэ не ўсталяваны, багаты на памылкі і перагібы час Дубоўка быў пазбаўлены магчымасці працягваць літаратурную дзейнасць. Паэт успамінае: «Я на немалы час пераключыўся на іншыя работы... Працаваў на розных вялікіх пабудовах, авалодаў многімі спецыяльнасцямі... Дзе б я ні быў, на якой бы працы ні стаяў, я ўсюды знаходзіў шмат прыгожага, шмат цікавага, сустракаў вельмі добрых людзей. Для мяне ніякая работа ніколі не была пакутай — яна заўсёды была для мяне жаданай, бо ўрэшце — ішла на карысць нашай сацыялістычнай бацькаўшчыны».

Вярнуўшыся ў літаратуру пасля XX з'езда КПСС, Уладзімір Дубоўка з маладым запалам піша і выдае за кнігаю кнігу. Яго зборнік «Палеская рапсодыя» адзначаны прэміяй імя Я. Купалы, з'яўляюцца дзівосныя Дубоўкавы казкі «Мілавіца», «Цудоўная знаходка», «Залатыя зярняты». І сам ён стаў падобен на чарадзейнага казачніка: высокі, шыракаплечы, з сінімі юначымі вачыма, прыгожым тварам і белаю барадою. Калі б спатрэбілася стварыць тыпізаваны вобраз беларуса, лепшай натуры, як Дубоўка, не знайсці. Мабыць таму выдатны ленінградскі скульптар, лаўрэат Ленінскай прэміі М. Анікушын стварыў мармуровы партрэт Уладзіміра Мікалаевіча.

Яго аповесць «Жоўтая акацыя» разнасцежыла перад юнакамі дзівосны свет роднай прыроды, натхнёная кніга «Пялёсткі» — своеасаблівая споведзь тонкага пранікнёнага лірыка, цыклы вершаў «Чакае ля берагу човен мяне», «Пасля вандравання», «Светлыя ўспаміны», яго пераклады санетаў Шэкспіра, паэм Байрана, вершаў Гётэ, Славацкага, Сыракомлі, многіх усходніх паэтаў — сапраўдны творчы подзвіг, узор перакладчыцкага майстэрства. У 1965 годзе выйшлі два тамы выбраных твораў У. Дубоўкі. Кнігі яго лірыкі выдаваліся ў перакладзе на рускую мову, асобныя творы перакладаліся на англійскую, польскую і мовы народаў СССР.

Светлы талент, высокая культура, дабрата і мудрасць — нязменныя рысы Уладзіміра Дубоўкі, незабыўнага чарадзея слова, мудрага знаўцы людскіх душ. Творам яго наканаваны доўгі век і светлая слава.

Сяргей ГРАХОЎСКІ.

Уладзімір ДУБОЎКА

НІКОЛІ ПРАЎДА НЕ ЎМІРАЕ

Жыццё закон нязломны мае:
ніколі праўда не ўмірае.

Адно хоць зернетка малое,
ды застанецца пра былое.

Ні на пяску, ні на каменні
ушчэнт не выпетрэе зерне:
узыдзе, ўсходы будуць з
плёнам,
з адзінак вырастуць мільёны...

1929

ВЕРАС

Ты пяжыш у мяне на далоні,
найдрабнейшая з кветак.
Я пытаўся, пытаю сягоння:
чым ты вабіш нас гэтак!

Ледзь прыкметны для нашага
вока,
быццам зернетка маку.
Ад зямлі не расцеш ты
высока,
і заўважыць не ўсякі.

А калі расцвіцеш на узлессі,
закрасуеш у пушчы, —
хараством ты тады апранешся,
сапраўды, неўміручым.

Найдрабнейшыя кветкі
ствараюць, —
твае, верас любімы, —
пекнату, што гарыць, не згарае
у цудоўных кілімах.

Як пабачу цябе, так і ўспомню
пералескі, палеткі,
дзе калісьці ўзяў на далонь я
ўпершыню твае кветкі.

1958

А КОЛЬКІ Б ДЗЕ НІ ВАНДРАВАЎ

А колькі б дзе ні вандраваў,
хоць добра ўсюды і прыгожа,
мяне цягнула да Пастаў,
хацелася пабыць ля Доўжа.

У айчыне многа гарадоў
і вёсак — незлічоны шэраг.
А ўсё ж адсюль я ў свет
пайшоў,
і тут ён, гэты самы бераг.

Матуля тут сваёй рукой
мне на кашулі прала кужаль.
Закрыта ўсё сырой зямлёй,
і аб сынах яна не тужыць...

На гэтай, на сырой зямлі
расло і спела тое збожжа,
з якога самі мы раслі
для працы ўпартай,
пераможнай.

На гэтай, роднай мне зямлі
бывала гора больш, чым
сніцца.

Цераз яе не раз ішлі
праклятых войнаў калясніцы.

За разам раз — цяжэй, цяжэй
яна здрыгалася ад болю.
А ўсё ж прыйшла для ўсіх
людзей,
шчаслівая настала доля!

Спаткаўся з роднаю зямлёю,
жадаю шчырым сэрцам
роднай:
каб больш не знацца нам
з вайной,
каб больш не знаць вайны
ніводнай!

1958

* * *

Родная мова, цудоўная мова!
Ты нашых думак уток і аснова!

Матчын дарунак ад самай
калыскі, —
ты самацветаў яскравая нізка.

Кожны з іх барвы дзівосныя
мае,
вечным агнём зіхаціць —
не згарае.

Ты мне заўсёды была
дапамогай,
дзе б і якой ні хадзіў я
дарогай.

Чую ў табе перазвоны
крыніцы,
чую ў табе і раскат
навальніцы,

чую павевы зялёнага бору,
водгулле працы ў родным
прасторы.

Кожнай драбнічкай ты варта
пашаны,
кожнае слова вякамі стварана.

І на вякі яно жыць застанецца,
вечнае так, як народнае сэрца.

1966

ЗБІРАЮЦЦА ЭКСПАНАТЫ ДЛЯ МУЗЕЯ

ДЗІВІНСКІЯ МОДНІЦЫ

У розных кірунках раз'язджаюцца штомесяц навуковыя супрацоўнікі групы, занятай стварэннем Беларускага дзяржаўнага музея архітэктуры і быту. Едуць, каб адшукаць даўнейшыя пабудовы, знайсці старажытныя рэчы. Амаль кожная такая паездка заканчваецца цікавымі знаходкамі. Шмат рэчаў прывезена ўжо з Падняпроўя і Паазер'я, са Случчыны і Піншчыны. Але, бадай, самымі плённымі аказаліся апошнія навуковыя экспедыцыі ў Кобрынскі раён — вёскі Дзівінскага сельсавета. Ад Кобрына да Дзівіна — 33 кіламетры на поўдзень.

Нядаўна мяне паслалі ў вёску Хабовічы апісаць інтэр'ер старой хаты дзеда Фёдара Грома, якому падбіраецца пад сотню гадоў. Хату пабудаваў яго бацька ў канцы мінулага стагоддзя. Сын Фёдара Якубавіча жыве побач у новым доме.

Тут мяне сустрэў радыёманцёр з вёскі Дзівін Васіль Свідуновіч і запрасіў да сябе. У яго спыняўся наш супрацоўнік Павел Церашковіч. Ён быў на месяц раней і набыў для музея больш за сотню рэчаў. Я нават не думаў, што змагу сабраць яшчэ што-небудзь. Але вечарам да Свідуновічаў прыйшлі бабулі. Даведаўшыся, што мне можна прадаць старое адзенне, яны прынеслі ўборы сваёй маладосці. Да позняй ночы вёў я афармленне дакументаў на прынятыя прадметы.

За два дні я сабраў 135 старажытных рэчаў, з іх толькі ў вёсцы Дзівін — 82. Прапаноўвалі мне перш за ўсё жаночую вопратку. Яна тут цудоўна захавалася. Я набыў каля паўтара дзесятка латух (світак), сярод іх белыя — шлюбныя, шэрыя — святочныя і карычневыя — штодзённыя і святочныя. Жаночыя суконныя латухі, як правіла, упрыгожваліся, кветкаваліся: нашывалі каляровыя «пампоны» на пазусе, разрэзах і «вусах» (клінах у таліі). Шмат набыта фартухоў. Няма і двух падобных. Так маглі вар'іраваць узоры, яго адценні дзівінскія майстрыхі. Вышывалі завязкі, зборку, шво. Жанчыны часта завязвалі некалькі фартухоў адразу так, каб быў бачны самы галоўны ўзор, які звычайна рабіўся ўнізе. Іншы раз да фартуха прышываліся карункі. Нягледзячы на ўсю разнастайнасць фартухоў, выразна бачны адзіны стыль: перабіраныя папяровыя шырокія і вузкія палосы белага, шэрага і чырвонага колеру. Агаф'я Лагвіновіч прапанавала фартух у чырвона-белыя палосы з цёмна-сіняй строчкай, з упрыгожанай зборкай і жаночую сарочку, што зрабіла яе маці Параска Люльковіч у пачатку XX стагоддзя. Выткана сарочка з кужэльных нітак. Рукавы і манішка ўпрыгожаны. На рукавах прышыты матэрыял з геаметрычным узорам чырвона-чорнага колеру. Манжэт вышыты «крыжыкам» тых жа колераў.

Таццяна Свідуновіч прынесла для музея 9 прадметаў. «Палатнянік» (так называюць тут кужэльна-баваўняную спадніцу) сваімі шэра-белымі і чырвонымі палосамі ўнізе нагадвае ручнік і «настольнік». Чырвоныя палосы («сцежачкі») ззаду — вузкія, а спераду — шырокія. А ў палосах вытканы сімвалічны ўзор — паўтарэнне літары «Ж». Так і напрошваецца меркаванне, што ў гэтым узоры — пэўны жыццёвы сэнс: жыць, жыта, жыллё, жанчына, жонка...

Шмат фантазіі прыкладалі дзівінскія жанчыны і для вырабу «настольнікаў», паясоў і ручнікоў. Ручнікі з геаметрычным узорам, вытканыя «ў чатыры ніты» і «ў ёлачку», часта вышываліся. Здзіўляюць мастацкім густам ручнікі і абрусы Ганны Андранюк, якія яна выткала ў пачатку стагоддзя.

Купіў я таксама і нажную ступу, якую зрабіў больш за 80 гадоў назад Іван Пашковіч. Стаяла яна ў прыбудоўцы да хаты. У сцяне быў замацаваны крук з сука, за які трымаўся работнік, калі тоўк проса, ячмень ці грэчку.

Дзівін сёння — цэнтр калгаса «Новае жыццё». Жыве тут каля пяці тысяч чалавек. Ёсць тры школы, тры бібліятэкі, магазіны, дзве дашкольныя ўстановы, бальніца, маслазавод, сушыльны завод, пякарня, мэблевая фабрыка. Імклівыя сучасныя рытмы ўладараць тут, як і паўсюль у нашым краі. Але на дзіва поўна захавалася ў Дзівіне і традыцыйная народная культура, матэрыяльныя ўзоры якой зоймуць дастойнае месца ў Беларускім дзяржаўным музеі архітэктуры і быту.

Уладзімір ТУТАЕЎ.

НА ЗДЫМКАХ: новыя набыткі збіральнікаў. Кофта і спадніца (палатнянік), зробленыя ў пачатку XX стагоддзя Параскай ЛЮЛЬКОВІЧ і Таццянай СВІДУНОВІЧ.

Фота К. ВОРАНАВА.

✦ ЗАТРАТЫ НА КУЛЬТУРУ ДАЮЦЬ ПРЫБЫТАК НЕ Ў РУБЛЯХ
✦ ЦІ МАГЧЫМА ШЧАСЦЕ БЕЗ ПЕСНІ!
✦ ДУХОЎНАЕ БАГАЦЦЕ — НАЙКАШТОЎНЕЙШЫ НАБЫТАК

ЭНТУЗІЯСТЫ

Людзей у маладзечанскай электрычцы няшмат. Будні дзень, раніца. У асноўным гэта гараджане-пенсіянеры, што едуць на дачы. Але вось мінулі Вязынку, Баяры, і мой пажылы сусед, якога я ў думках таксама палічыла за дачніка, раптам павярнуўся ад акна:

— От я ўсё гляджу: на кожнай станцыі алімпійскія лозунгі, плакаты, ідзе падрыхтоўка да сустрэчы гасцей... І ведаеце, мне неяк шкада, што гэтыя госці прыедуць у другой палове ліпеня і ніхто з іх не зможа ўбачыць Купальскае свята, не пачуе даўнія народныя песні, што так хораша гучаць ля начнога вогнішча. У нас дык свята наладжваюць на лузе проста за гарадскім паркам...

Так, дапытлівым замежным турыстам, мусіць, цікава было б паглядзець на такую «экзотыку». Пошукі сімвалічнай кветкі шчасця займаюць адну кароткую летнюю ноч. А працуе дзеля свайго шчасця чалавек цэлы год, усё жыццё. І як многа паняццяў стаіць за гэтым кароткім словам!

Простае шчасце людское,
Так, як і наша з табою,
Пэўна, складаецца з солі,
З хлеба, сабранага ў полі,
З поту, дарожнага пылу,
З роднага небасхілу,
З дружбы, мацнейшай
ад смерці,
З песні... І так мне здаецца:
Каб з чаго іншага скласці,
Дык ці было б яно шчасцем.

Верш Максіма Танка я ўспомніла ў час гутаркі з загадчыцай аддзела культуры Маладзечанскага гарвыканкома Галінай Законнікавай, як толькі мы закранулі праблемы духоўнага жыцця гараджан. Калі чалавек мае хлеб і да хлеба, ён больш поўна скарыстоўвае вольны час на набыццё духоўных каштоўнасцей: імкнецца паглыбіць веды, зрабіць займальным і цікавым адпачынак, развіць свае прыродныя здольнасці. З'ява гэтая, увогуле, назіраецца ў нашым грамадстве паўсюль, але ў Маладзечна яна найбольш уражвае, бо тутэйшыя энтузіясты славяцца сваёй дзейнасцю нават за межамі Беларусі.

— 4 500 гараджан удзельнічаюць у мастацкай самадзейнасці, — гаворыць Галіна Уладзіміраўна. — І ўзровень падрыхтоўкі многіх творчых калектываў такі, што іх цёпла прымае самая патрабавальная аўдыторыя. Народны ансамбль песні і танца, напрыклад, быў ужо ў Балгарыі, ГДР, выступалі маладзечанцы ў гарадах Савецкай Прыбалтыкі, на БАМе, у Міхайлаўскім на Пскоўшчыне... Падобныя паездкі вельмі яднаюць людзей, пашыраюць іх кругагляд. А поспехі адных выклікаюць узлёт фантазіі, прагу дасканаласці ў іншых. Зусім нядаўна на заводзе сілавых паўправадніковых вентыляў з'явіўся ансамбль «Беларусачка». Стварыла яго Марыя Міхайлаўна, жонка Язэпа Сушко, самадзейнага кампазітара, які шмат гадоў плённа працуе мастацкім кіраўніком гарадскога народнага ансамбля песні і танца. Ведаеце, гэтае творчае саперніцтва-супрацоўніцтва на карысць агульнай справе. У новым калектыве ўжо больш за 70 чалавек, іх выступленні прыхільна сустрэлі гараджане і вяскоўцы. Выкладчык музычнага вучылішча Рыгор Сарока арганізаваў сімфанічны аркестр. Дык на яго канцэрты ідуць ахвотней, чым на гастролі прафесійных сімфанічных калектываў.

— Своеасаблівы мясцовы патрыятызм?

— Я б сказала: павага да землякоў, да іх клопатаў. Калі мы праводзім штогадовы фестываль мастацтва, у ім удзельнічаюць усе нашы самадзейныя калектывы, бо гэта свята для ўсіх гараджан. Хаця аднаму падабаецца духавы аркестр, другому — вакальна-інструментальны ансамбль, а трэцяму — хор. Сёлета ў Дзень Перамогі мы наладзілі тэатралізаванае прадстаўленне на стадыёне. Удзельнічаў зводны духавы аркестр, хор з сямісот чалавек... Уражанне незабыўнае!

На патрэбы аддзела культуры з гарадскога бюджэту выдзяляецца на год больш за 300 тысяч рублёў. Яны ідуць на ўтрыманне штата спецыялістаў, на набыццё музычных інструментаў, касцюмаў і г. д. Зазначу, што новыя ўборы для самадзейных артыстаў з народнага ансамбля песні і танца былі набыты сёлета за 10 тысяч рублёў. Прыбыткаў жа ад культурных мерапрыемстваў горад не плануе. Грошы, якія клубы і Дамы культуры маюць ад правядзення танцавальных вечароў, арганізацыі платных курсаў крою і шыцця і да т. п., ідуць на патрэбу гэтых самых культурных устаноў.

Матэрыяльныя клопаты, тым не менш, займаюць маю субяседніцу. Гораду ўжо не хапае тых трох Дамоў культуры і шасці клубаў, якія ён мае. На наступную пяцігодку плануецца ўзвядзенне Дома моладзі. Каб прыспешыць адкрыццё танцпляцоўкі ў гарадскім парку, Галіне Уладзіміраўне давялося ўзяць на сябе кантроль за яе будаўніцтвам...

— Але я адкрыю вам галоўны сакрэт: у нас ёсць з кім працаваць, — шчыра ўсміхаецца мне прывабная трыццацігадовая загадчыца аддзела культуры. — Без добраахвотнікаў-энтузіястаў нашы 60 супрацоўнікаў не адолелі б такі абъём работы. Напрыклад, у красавіку мы наладзілі вечар, прысвечаны памяці вядомага кампазітара, нашага земляка Міхала Клеафаса Агінскага. Акрамя яго паланезаў і рамансаў, выконваліся творы Гайдна і Шапэна, Баха і Свірыдава... Асноўны цяжар, як вы разумееце, «лёг» на выкладчыкаў музвучылішча. А калі рыхтаваўся вечар пра творчасць Бялыніцкага-Бірулі, то Міхаіл Чайкін, кіраўнік бюро эстэтыкі мэблевай фабрыкі, наладзіў выстаўку работ славутага беларускага мастака з музейных фондаў.

Галіна Уладзіміраўна называе ўсё новыя прозвішчы рупліўцаў, і я радуюся разам з ёю, бо гэтых людзей ведаю, ніколі раней не быўшы ў Маладзечна. Мастакі Ядвіга Раздзялоўская і Кастусь Харашэвіч. Дырэктар размешчанага ў Маладзечна Мінскага абласнога краязнаўчага музея Генадзь Каханоўскі — нястомны збіральнік гістарычных і культурных каштоўнасцей, даследчык, асветнік. Чытачы «Голасу Радзімы» могуць прыпомніць яго цікавыя публікацыі на старонках штотыднёвіка, а я дадам, што ён аўтар кніг па краязнаўству, піша артыкулы для выданняў Беларускай Савецкай Энцыклапедыі. Апошнім часам Генадзь Аляксандравіч узначальвае літаб'яднанне «Купалінка», створанае пры мясцовай газеце больш за дваццаць гадоў назад. Сярод тых, хто пачынаў тут творчую дзейнасць, вядомыя літаратары Адам Мальдзіс, Арсен Ліс, Рыгор Семашкевіч... Падаюць надзеі і маладыя паэты Маладзечаншчыны. А пра Уладзіміра Зянько Генадзь Каханоўскі расказаў мне як пра унікальны выпадак. І сапраўды, у 40 гадоў чалавек пачаў пісаць вершы, маючы ўзнагароды і прэміі за рацыяналізатарскія прапановы... у лакаматыўным дэпо і адукацыю — чатыры класы польскай школы. Пахадзіўшы на пасяджэнні літаб'яднання, ён купіў магнітафон і ад сваёй 80-гадовай маці-сялянкі запісаў амаль трыста песень. Паводле слоў Генадзя Цітовіча, сярод іх ёсць невядомыя нашай фальклярыстыцы. Цяпер Уладзімір Зянько і Язэп Сушко праводзяць гэтыя магнітафонныя запісы на паперу — будзе выключная публікацыя. Галіна Законнікава адразу ж нагадвае, што песню маладзечанскага кампазітара Зінкевіча пра дзявочыя чорныя вочы «Песняры» разнеслі па ўсім свеце...

Ах, шкада, што я не пазнаёмілася з тым чалавекам у электрычцы! Відаць, ён таксама з маладзечанскіх энтузіястаў.

Валянціна СЕРГІЕЎСКАЯ.

БЕССМЯРОТНЫ БАТАЛЬЁН

Навечна паўстаў, увасоблены ў метале і граніце мемарыяльнага комплексу, бясстрашны батальён міліцыі на былой баявой вышыні каля Зялёнага Гаю пад Магілёвам.

Асобы батальён міліцыі быў сфарміраваны ў першыя дні вайны. Воіны ў сініх шынялях занялі пазіцыю на паўночных подступах да Магілёва — каля вёскі Гаі і Пашкова. Сюды і рынуліся гітлераўцы пасля няўдалых спроб прарваць абарону на заходнім напрамку. Нягледзячы на вялікую перавагу праціўніка ў жывой сіле і тэхніцы, батальён адбіў усе атакі. На працягу шасці дзён воіны-міліцыянеры стаялі насмерць. З 250 абаронцаў засталося толькі 19, ды і тыя былі раненыя.

Бессмяротны подзвіг воінаў-міліцыянераў увекавечылі скульптары М. Кавалёў і К. Аляксееў.

БРЭХТ У ОПЕРЫ

Актуальнасць тэмы вызначае новую оперу заслужанага дзеяча мастацтваў БССР С. Картэса. Напісана яна паводле добра вядомага антываеннага твора Б. Брэхта «Матухна Кураж і яе дзеці». Гэта першая ў савецкім мастацтве спроба перакласці брэхтаўскую драматургію на мову опернага тэатра. Матэрыял атрымаў своеасаблівае музычнае вырашэнне: побач з трагічнымі інтанацыямі — іронія, востры гумар, выкрывальны сарказм... Над лібрэта працавалі У. Халіп (адзін з аўтараў лібрэта першай оперы С. Картэса «Джардана Бруна») і рэжысёр С. Штэйн.

«Матухнай Кураж» ужо зацікавіліся некаторыя творчыя калектывы краіны. Новы твор быў абмеркаваны і ўхвалены мастацкім саветам Дзяржаўнага тэатра оперы і балета БССР. Ён прыняты да пастаноўкі на будучы год у Свярдлоўскім тэатры оперы і балета.

АДДАНАСЦЬ МАСТАЦТВУ

Ленінградскі мастак Генрых Паўлоўскі, выстаўка твораў якога адкрылася ў залах Саюза мастакоў БССР, нарадзіўся ў сям'і беларускага рабочага, бальшавіка і падпольшчыка. Дзяцінства і юнацтва яго прайшлі ў Беларусі.

У 1929 годзе, пасля заканчэння Віцебскага мастацкага тэхнікума, дзе яго першым педагогам быў народны мастак БССР В. Волкаў, ён прымае ўдзел у рэспубліканскіх выстаўках, працуе ў Беларускім дзяржаўным выдавецтве. Каб завяршыць мастацкую адукацыю, Паўлоўскі заканчвае інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры Усерасійскай акадэміі мастацтваў у Ленінградзе.

«Яго жывапісу ўласцівы былі каларыстычная арганічнасць, прыгажосць колеру, узвышанае яго гучанне. Ён разумеў якасць колеру, і ў яго нацюрмортах колеравая актыўнасць, спалучаючыся з пачуццём аб'ёму, прадметнасці, стварала ўражанне важкага цэлага», — гаворыць аб жывапісе Паўлоўскага яго вучань, народны мастак СССР Я. Майсеенка.

І гэтыя словы пацвярджае выстаўка, экспазіцыю якой склалі каля 150 жывапісных работ і малюнкаў мастака.

прэм'еры, выстаўкі, сустрэчы

У № 14 «Голасу Радзімы» сёлета мы пісалі пра беларускага мастака Міхася Сеўрука і яго выстаўку ў мінскім Палацы мастацтва. Пасля завяршэння гэтай выстаўкі большасць работ была накіравана ў Вільнюс. Яны экспанаваліся ў залах Літоўскага дзяржаўнага мастацкага музея. Жыхары братняй рэспублікі цёпла прынялі творы майстра з Нясвіжа.
НА ЗДЫМКУ: М. СЕЎРУК. «Дом рамесніка на рынку. Помнік архітэктуры XVII стагоддзя». Лінарыт. 1967 г.

ГОСЦЯ З БАЛГАРЫІ

Мінск наведала старшыня секцыі перакладчыкаў савецкай літаратуры Саюза перакладчыкаў Балгарыі, рэдактар выдавецтва «Народна култура» Пенка Кынева.

Пенка Кынева — актыўны прапагандыст беларускай літаратуры ў Балгарыі. У яе перакладзе на балгарскую мову апублікаваны раман І. Мележа «Подых навальніцы», аповесці «Млечны шлях» К. Чорнага, «Аксана» Б. Сачанкі, «Лісце каштанаў» У. Караткевіча. Сёлета ў яе перакладзе выйшла аповесць В. Быкава «Пайсці і не вярнуцца».

Зараз Пенка Кынева збірае матэрыял для зборніка беларускіх народных казак.

ДА ЮБІЛЕЮ ПЕСНЯРА

Драматычны калектыў гомельскага Палаца культуры будаўнікоў рыхтуе інсцэніроўку па вершах, паэмах, драматычных творах Янкі Купалы, прысвечаную 100-годдзю з дня нараджэння песняра беларускага народа. Спектакль складуць дзве часткі: «Народ у сэрцы песняра» і «Пясняр у сэрцы народа».

ВЫСТАЎКА ФОТАМАЙСТРА

У аддзеле мастацтва Віцебскага абласнога краязнаўчага музея экспануецца персанальная выстаўка віцебскага фатографа Г. Бяліцкага «Радзіма, праца, мір». Дзесяткі фотаздымкаў, фотаплакатаў, рэпартажаў і нарысаў расказваюць пра барацьбу савецкіх людзей за мір, пра ветэранаў вайны і працы, важныя падзеі ў жыцці рэспублікі.

ПАЕЗДКА Ў ПОЛЬШЧУ

З паездкі ў Польшчу вярнуліся два народныя калектывы Бабруйска — харавая капэла і вакальны ансамбль «Вяснянка». Яны пабывалі ў гарадах Улацлавеку, Торуні, Познані і Варшаве.

АРШАНСКІЯ ТАНЦОРЫ

У Палацы культуры тэкстыльшчыкаў Аршанскага льнокамбіната адбыўся конкурс выканаўцаў сучаснага бальнага танца, у якім прынялі ўдзел танцоры з Віцебска, Гомеля і Оршы.

Кампетэнтнае журы аднадушна прызнала пераможцамі тры пары аршанскіх танцораў.

«ЖАВАРАНКІ НАД ХАТЫННЮ»

Гэтая аповесць Алены Кобец-Філімонавай, якая расказвае пра ваенную трагедыю беларускай вёскі Хатынь, выйшла ў Казані. На татарскую мову яе пераклала Венера Ісхакава.

У Рэспубліканскім тэатры юнага гледача адбылася прэм'ера спектакля «Нахабнічак» па матывах апавядання славутага савецкага пісьменніка М. Шолахава. Галоўны герой — хлапчук, станаўленне характару, фарміраванне светапогляду якога адбываюцца ў складаных умовах часоў грамадзянскай вайны.
НА ЗДЫМКУ: у ролі Нахабнічка студэнтка першага курса Мінскага інстытута культуры Наталля ІВАННІКАВА.

Фота А. ДЗМІТРЫЕВА.

ДА АДКРЫЦЦЯ АЛІМПІЯДЫ-80 — ДВА ДНІ

Месяц назад вядомая грэчаская драматычная актрыса Марыя МАСКАЛІЎ запаліла полымя алімпійскага агню (на здымку), ад якога быў запалены факел будучых Гульняў. Эстафета агню пралягла па тэрыторыі Грэцыі, Балгарыі, Румыніі і СССР. Тысячы факеланосцаў нясуць агонь Алімпіяды як сімвал спартыўнай таварыскасці і высакароднасці алімпійскіх ідэалаў.

Фота В. ЗУФАРАВА.

БЫЦЬ У ЗБОРНАЙ — ВЯЛІКІ ГОНАР

У сённяшнім нумары мы працягваем прадстаўляць спартсменаў Беларусі, якія ўвайшлі ў склад зборнай каманды Савецкага Саюза, што будзе ўдзельнічаць у маскоўскай Алімпіядзе.

ВІКТАР УГРУМАЎ. Майстар спорту міжнароднага класа па коннаму спорту. Неаднаразовы чэмпіён СССР. Удзельнічаў у манрэальскай Алімпіядзе, дзе заняў чацвёртае месца ў камандным першынстве і шостае — у асабістым. Выступіць на кані Шквал.

ІРЫНА КАРАЧОВА. Майстар спорту міжнароднага класа па коннаму спорту. Чэмпіёнка Савецкага Саюза па выездцы. Выступіць на кані па клічцы Саід. Трэніруецца Ірына ў Віктара Угрумава.

МІКАЛАЙ АЛЁХІН. Майстар спорту міжнароднага класа па фехтаванню. Чэмпіён свету і СССР у камандных спаборніцтвах шаблістаў.

АЛЕНА БЯЛОВА. Заслужаны майстар спорту па фехтаванню, алімпійская чэмпіёнка 1968, 1972, 1976 гадоў, неаднаразовая чэмпіёнка свету і Савецкага Саюза. Узнагароджана ордэнам Дружбы народаў і двума ордэнамі «Знак Пашаны».

УЛАДЗІМІР ЛАПІЦКІ. Майстар спорту міжнароднага класа па фехтаванню. Экс-чэмпіён свету сярод юнакоў, чэмпіён свету, VII летняй Спартакіяды СССР і чэмпіён СССР у камандных спаборніцтвах рапірыстаў.

АЛЯКСАНДР РАМАНЬКОЎ. Заслужаны майстар спорту па фехтаванню. Неаднаразовы чэмпіён свету, сярэбраны прызёр Алімпіяды-76, неаднаразовы чэмпіён СССР.

ВІКТАР СІДЗЯК. Заслужаны майстар спорту па фехтаванню. Неаднаразовы чэмпіён і прызёр Алімпіяд 1968, 1972, 1976 гадоў, свету, СССР, лепшы фехтавальшчык на шаблях па класіфікацыі ФІЕ. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

ІРЫНА УШАКОВА. Майстар спорту міжнароднага класа па фехтаванню. Чэмпіёнка свету і СССР у камандных спаборніцтвах.

ІРЫНА СІДАРАВА. Майстар спорту міжнароднага класа па скачках у ваду. Уладальнік Кубка СССР 1979 года, пераможца спаборніцтваў на прыз газеты «Комсомольская правда» і міжнароднага турніра «Вясеннія ластаўкі» 1980 года.

УЛАДЗІМІР АЛЕЙНІК. Заслужаны майстар спорту па скачках у ваду, прызёр XXI Алімпійскіх гульняў, чэмпіён Еўропы, прызёр Кубка свету і чэмпіяната свету, пераможца сусветнай Універсіяды 1979 года, неаднаразовы чэмпіён СССР.

АЛЯКСАНДР КАСЯНКОЎ. Майстар спорту міжнароднага класа па скачках у ваду. Прызёр XXI Алімпійскіх гульняў, неаднаразовы пераможца і прызёр першынстваў свету, Еўропы, чэмпіён VII Спартакіяды народаў СССР.

АЛЯКСАНДР ПАРТНОЎ. Майстар спорту міжнароднага класа па скачках у ваду. Пераможца Кубка СССР 1979 года і міжнароднага турніра «Вясеннія ластаўкі» 1980 года.

ЧАКАЕМ ГАСЦЕЙ

Усё менш часу застаецца да той пары, калі на мінскія вуліцы прыйдзе свята спорту і маладосці — Алімпійскія гульні. У сталіцы Беларусі будуць праводзіцца папярэднія і адзін з чвэрцьфінальных матчаў алімпійскага футбольнага турніра, у якім прымуць удзел нацыянальныя каманды сямі краін. Мінск прыме звыш 11 тысяч савецкіх і замежных турыстаў.

Супрацоўнікі Мінскага бюро падарожжаў і экскурсій распрацавалі новыя маршруты. Госці змогуць прыняць удзел у экскурсіях «Горад-герой Мінск — сталіца БССР», «Мемарыяльны комплекс «Хатынь», «Курган Славы», «Мінск спартыўны», наведаюць славутыя мясціны горада, музеі, пазнаёмяцца з яго мінулым і сучасным, прамысловасцю, навукай, культурай.

У Купалаўскім парку яны пачуюць расказ аб творчасці песняра беларускай зямлі Янкі Купалы. Аглядная гарадская экскурсія закончыцца ў новым мікрараёне сталіцы, дзе задумы архітэктараў знайшлі ўвасабленне ў прыгожых і зручных дамах і ансамблях.

На экскурсіі «Мінск спартыўны» турысты пазнаёмяцца са спартыўнымі збудаваннямі горада, пабываюць у Палацы спорту, водна-спартыўным камбінаце, на крытых тэнісных кортах, у Раўбічах і Стайках і, вядома ж, на стадыёне «Дынама».

Для работы з удзельнікамі Алімпіяды і турыстамі рыхтуюцца 85 штатных экскурсаводаў. Акрамя гэтага, прымуць удзел няштатныя экскурсаводы, студэнты універсітэта і мінскіх інстытутаў.

Міхаіл ДУБРОВІН,
кіраўнік турысцкіх маршрутаў Мінскага бюро падарожжаў і экскурсій.

Гасцініца «Спорт» на Ленінскім праспекце ў Маскве. Тут жывуць госці Алімпіяды.
Фота М. МАЛЫШАВА і А. МАРКОЎКІНА.

ЗАЎСЁДЫ Ў СЭРЦЫ ТОЕ ЛЕТА

Музыка Ю. СЕМЯНЯКІ Вершы П. БРОЎКІ



Заўсёды ў сэрцы тое лета,
Калі дамоў мы ўсе ішлі,
І Беларусь страчала ласкай
Сыноў на роднае зямлі.
Сясцёр і матак нашых слёзы
Не абсыхалі ў гэты час,
І слёзы падалі з бярозак,
Што бачылі ў абдымках нас.

Яліны, сосны нас віталі
Між акрываўленых шляхоў.
А нас чакалі, нас чакалі
Шарэнгі чорных каміноў.
Ды паміж стогнаў і між плачу
Мы кветкі бачылі ў руках,
Мы чулі першы смех дзіцячы
І промні бачылі ў вачах.

Ды йшлі з прыпынкаў, як віхура,
Далей на бой за родны край —
І першы бачылі падмурак,
І першы вольны ураджай.
І першы рой па-над садамі,
І першы ў бляску зорны дом,
І родны сцяг, які над намі
Кружыў чырвоным галубком.

Заўсёды ў сэрцы тое лета,
Калі дамоў мы ўсе ішлі...

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ

НАШ АДРАС:
МІНСК-ГСП, ЛЕНІНСКІ ПРАСПЕКТ, 44.
ТЭЛЕФОНЫ: 33-01-97, 33-02-80, 33-03-15, 33-16-56, 33-07-82.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.
Зак. 1028